# У сучаснай плыні

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося ўрачыстае адкрыццё выстаўкі італьянскай графікі. Гэтую падзею можна смела назваць значнай і асаблівай, таму што ўпершыню ў Беларусі акрамя твораў ужо знаёмых італьянскіх мастакоў прадстаўлены творы Джорджыо дэ Кірыка, Энрыка Мастраякі, Рыкарда Бенвенуці.

На выстаўцы можна ўбачыць і тэматычныя, і абстрактныя кампазіцыі, і чароўныя жаночыя партрэты, і старажытных рыцараў, і міфалагічных герояў.

"Я думаю, што мы з вамі заслугоўваем, каб нас акружала сапраўдная, высокая культура, каб мы з дзяцінства ведалі, што гэта частка нас — той жа Сальвадор Далі ці Джорджыо дэ Кірыка — як і нашыя знакамітыя мастакі, — падзяліўся сваім меркаваннем мастак, куратар выставак і мастацкіх праектаў, загадчык аддзела галерэйна-выставачнай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Фёдар Ястраб — Мы павінны ведаць і другіх мастакоў графікі. Мы нікольki не прыніжаем нашa мастацтва. Мы толькі хочам, каб наша мастацтва не дзесьці з боку было, а каб яно было побач з еўрапейскім мастацтвам, каб яно перапляталася з ім, каб яно было



арганічнай часткай мастацкіх працэсаў, якія ідуць у свеце..."

У сваім выступленні народны мастак Беларусі і СССР Георгій Паплаўскі адзначыў: "Падсвядомая творчасць вельмі своеасаблівая і не заўсёды зразумелая, калі чалавек упершыню сустракаецца з падобным. Лічу, што для нашай моладзі і нашага гледача карысна сутыкацца з гэтым падсвядомым поглядам на свет".

**Ілона КУПРЭЙЧЫК**

*На здымку: Фёдар Ястраб*

*Фота аўтара*

РЕПОЗИТОРИЙ